5. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 2. Циркуляры, декреты и распоряжения комиссара Брест-Литовского повета (подлинники и копии) и переписка с ними об открытии торгово-промышленных предприятий, взимании налогов с населения и др. хозяйственным вопросам; сведения о посевах сельскохозяйственных культур в окрестности г. Бреста в 1918-1919 гг., списки коммунальных предприятий и улиц г. Бреста. Анкета от ноября 1919 г. о причинении городу ущерба немецкими оккупантами в 1915-1918 гг.

6. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 6. Протоколы заседаний и списки радных Брестской городской рады.

7. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 7. Протоколы заседаний Брестской городской рады за 1922 г.

8. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 14. Регламент Брестского городского магистрата, заявления жителей г. Бреста о приеме их на службу и списки служащих магистрата.

9. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 119. Выписки из протоколов заседаний Брестской городской рады и регламент городской библиотеки.

10. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 120. Протокол заседания врачей по борьбе с холерой; списки санитаров и переписка с санитарными инспекторами о санитарном состоянии г. Бреста.

11. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 360. Списки представителей органов власти Полесского воеводства и владельцев промышленных и ремесленных предприятий.

12. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 418. Дело о состоянии строительных работ по г. Бресту.

13. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 671. Регламент Брестского городского магистрата.

14. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 1372. Статистические сведения о строительстве в г. Бресте и отчёты о работе строительно-технического отдела.

15. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 1612. Списки промышленных и торговых предприятий.

16. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 6412. Объявления Брестского городского управления о мобилизации и списки военнообязанных.

17. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 6789. Финансовый отчет Брестского городского управления за 1937-1938 гг.

18. Фонд 5. – Оп. 1. – Д. 6915. Статистические сведения о ценах на продукты по г. Бресту.

## УЗ'ЯДНАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БССР – ЭТАП НА ШЛЯХУ РЭАЛІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ

**Кавалёва Н.М.**
УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт»

У грамадстве не сціхаюць спрэчкі наконт сутнасці беларускай нацыянальнай ідэі. У вызначэнні гэтага феномена бяруць удзел не толькі гісторыкі, філосафы, палітолагі, але і палітыкі. І гэта нездарма. Таму што канцэпцыя дзяржаўнасці грунтуецца на нацыянальнай ідэе. А ідэалогія дзяржаўнасці вызначае сутнасць нашай дзяржаўнасці і перспектывы яе развіцця. Ёсць спробы адмаўляць сам факт існавання беларускай нацыянальнай ідэі, альбо, пры прызнанні наяўнасці гэтай ідэі, дэклараваць яе "штучны" характар, акцэнтаваць ўвагу на быццам-бы незавершанасці працэсу фармавання беларускай нацыянальнай ідэі. Ёсць спробы падмяняць беларускую нацыянальную ідэю агульнай славянскай ідэяй, альбо ідэяй саюзнай дзяржаўнасці.

Але сам факт існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь сведчыць на карысць таго, што беларуская ідэя існуе.

У большасці краін у той ці іншай ступені прысутнічае нацыянальная ідэя. Яе змест, сэнс, які ўкладваецца ў паняцце "нацыянальная ідэя", залежыць ад умоў фармавання нацыі, і па-рознаму трактуецца прадстаўнікамі розных навуковых школ. У рамках этнакультурной школы нацыя вызначаецца праз аб'ектыўныя характэрыстыкі, якія выказваюць этнакультурную ідэнтычнасць, такія як этнічная тэрыторыя, агульныя міфы і гістарычная памяць, масавая, публічная культура. Мадэрнісцкая канцэпцыя нацыі падкрэслівае свядомае канструяванне нацыі палітычнымі сіламі. Асобная роля ў гэтым працэсе адводзіцца дзяржаве. Дзяржава – гэта аснова нацыі, інструмент яе прасоўвання і, ў рэшце-рэшт, стварэння [1]. Прыклад пабудовы нацыі на грамадска-палітычным адзінстве даюць ЗША. Усім вядома сфармуляваная у 30-я гады XX стагоддзя так званая "амерыканская мара". Яна ўтрымоўвала ў сабе ўяўленне аб роўнасці магчымасцей і неабходнасці дасягнення вызначанага жыццёвага стандарту. Трэба сказаць, што ў спалучэнні з асабістай свабодай гэтая "мара" дасягнула пэўнага выніку. Цяперашняя магутнасць ЗША шмат у чым з'уляецца наступствам рэалізацыі гэтай амерыканскай мары. Нямецкая нацыя, як вядома, будуецца на культурна-этнічным адзінстве. Такі падыход да фармулёўкі і рэалізацыі нацыянальнай ідэі таксама можа быць канструктыўным.

Існуе і "руская ідэя" – гэта месіянская ідэя аб асобным прызначэнні рускага народу для лёсу свету. Нікуды не знікла ў расійскім самавызначэнні ўсведамленне сябе як вялікага народа, тытульнай нацыі і гаспадара агромістай імперыі. У нашых суседзяў палякаў стрыжнем нацыянальнай ідэі з'яўляецца ўсведамленне свайго народа, як народа, што меў славутую гісторыю, меў некалі дзяржаву "ад мора да мора". Польшча і сёння схільна лічыць сябе ўсходне-еўрапейскім лідэрам і разглядаць Беларусь як сферу свайго ўплыву.

Для разумення сутнасці беларускай нацыянальнай ідэі не трэба нічога вынаходзіць. Нельга забываць аб гістарычнасці феномена "нацыянальная ідэя" і правільна вызначыць, правільна зразумець, лінію гістарычнага развіцця нашага народа, для таго, каб яе карэктна працягваць [2].

Дык калі ж у свядомасці нашага народа аформілася нацыянальная ідэя? Для адказу на гэтае пытанне трэба звярнуцца да гісторыі фармавання беларускай нацыі.

Працэс этнагенезу беларусаў быў вельмі складаным і супярэчлівым. З аднаго боку, беларускі этнас з'яўляецца вельмі старажытным, бо ён складзены з такіх "кубікаў", як субстратнае насельніцтва жалезнага стагоддзя і некалькі хваль славянскай каланізацыі. У эпоху Полацкага княства і ў эпоху Вялікага Княства Літоўскага склалася ўжо большасць рыс, якія аб'ектыўна сведчылі пра існаванне адмысловага этнасу. З іншага боку, ніводная з ідэй, якія валодалі масавай свядомасцю ў тыя часы, не супадала з арэалам рассялення этнасу [3].

Этнічная самасвядомасць фармавалася складана, яе змест не заставаўся нязменным. Этнічная самасвядомасць – гэта сістэма ўяўленняў этнасу пра свае асаблівасці, якія вылучаюць яго з іншых аналагічных утварэнняў, адна з асноўных прыкмет этнасу. Яна ўключае этнічную самаідэнтыфікацыю (усведамленне сваёй прыналежнасці да пэўнай этнічнай супольнасці), уяўленне аб агульнасці паходжання членаў этнасу, адзіным гістарычным мінулым, уяўленне аб тыповых рысах сваёй супольнасці..., усведамленне этнічных інтарэсаў [4]. Этнічная тэрыторыя, на якой фармаваўся беларускі этнас, амаль заўсёды была цэльнай: і ў часы Полацкага княства, і у часы ВКЛ, і у часы Рэчы Паспалітай, і нават пасля яе падзелаў. На гэтай тэрыторыі ў часы ВКЛ сфармаваўся выключна поліэтнічны соцыум (полікультурны, полімоўны, поліканфесійны). У гэтых умовах самасвядомасць нашых продкаў набыла дзяржаўнае адценне: асноўную ролю ў ёй адыг-

рывала прыналежнасць да Вялікага Княства Літоўскага. Адсюль ужыванне этноніма "ліцвіны", які вызначаў прыналежнасць беларусаў да дзяржаўнага цэлага, а з XVI стагоддзя этноніма-удакладнення "ліцвіны-беларусы", які будаваўся на прыналежнасці не толькі да дзяржавы, але і да зямлі [5].

У наступны перыяд беларускі этнас выпрабоўваў пагрозу асіміляцыі адразу з двух бакоў. Звычайна цяжка паддаюцца асіміляцыі народы з непадобнымі, супроцьлеглымі антрапалагічнымі рысамі, да прыкладу, славяне і цюркі. Беларусы ж з спрадвеку жылі і жывуць на сумежжы з чатырма вельмі блізкімі да іх паводле антрапалагічных прыкметаў і культуры народамі. І таму пры неспрыяльных акалічнасцях яны даволі часта адмаўляліся ад сваёй этнічнай прыналежнасці. Узнікалі такія акалічнасці не самі па сабе, а ў выніку свядомай дзейнасці дзяржаўных улад па паланізацыі і русіфікацыі. Але, не гледзячы на магутныя асіміляцыйныя плыні, беларускі этнас, тым не менш, захоўваў сваю адметнасць. Важнымі фактарамі, якія гэтаму спрыялі, былі адзінства этнічнай тэрыторыі, дастатковая шматлікасць этнасу, захаванне культурных традыцый і мовы (паланізацыя і русіфікацыя захапілі ў асноўным афіцыйную культуру). Гэта былі тыя фактары, якія дазволілі палітычнай і культурнай эліце свядома фармаваць нацыю на базе беларускага этнасу.

Такая ключавая прыкмета этнасу, як суб'ектыўна ўсвядомленая нацыянальная ідэя, з'явілася ў другой палове XIX ст. Праўда, працэс выспявання гэтай ідэі ішоў з канца XVIII стагоддзя, ад прыняцця Канстытуцыі 1791 г., якая паўплывала на ўсё тагачаснае грамадства. Творчасць Юліана Нямцэвіча, Юстына і Тэадора Нарбутаў дапамагала нацыянальна вызначыць Беларусь праз прызму гісторыі беларускай дзяржаўнасці, садзейнічала фармаванню разумення адметнасці беларускага этнасу. Гэта было няпроста, таму што адукаваная частка беларускага грамадства доўгі час знаходзілася пад уплывам польскай нацыянальнай ідэі і жыла надзеяй на аднаўленне Рэчы Паспалітай.

З'яўленне новай беларускай літаратуры, таксама як і фармаванне навуковага беларусазнаўства, садзейнічала росту нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, што праяўлялася ва ўсведамленні насельніцтвам беларускіх зямель сваёй адметнасці, успрыняцця факта існавання беларускай народнасці і права гэтай народнасці на свабоднае развіццё ў межах сваёй краіны. Такім чынам, паўставала і афармлялася беларуская нацыянальная ідэя, і гэта была ідэя не проста стварэння незалежнай беларускай дзяржавы, а ідэя стварэння дэмакратычнай народнай дзяржавы, у аснову якой пакладзены і парламенцкі вопыт ВКЛ, і канстытуцыйны і парламенцкі вопыт Англіі, ЗША, Францыі. Менавіта так трактаваў галоўную задачу, якая стаяла перад беларускім народам, К. Каліноўскі. Рэвалюцыянер-дэмакрат К. Каліноўскі вылучыў задачу стварэння незалежнай беларускай дзяржавы, прыняўшы мадэль кіравання краінай у форме нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання, выкарыстоўваючы вопыт Вялікага Княства Літоўскага.

Галоўным прыгнятацелем беларусаў Каліноўскі бачыў царызм і таму лічыў, што беларускім рэвалюцыйным сілам трэба арыентавацца на Польшчу і польскі рэвалюцыйны рух: гэта можа гарантаваць самакіраванне братэрскім народам [6].

Беларускія народнікі, і ў тым ліку вядомая група "Гоман", стаялі на пазіцыі падтрымання і прапагандавання абласной самастойнасці беларускіх зямель у складзе расійскай дэмакратычнай рэспублікі. Іх надзеі былі звязаны з крушэннем самадзяржаўнага ладу і працэсам дэмакратызацыі Расіі. Створаная ў 1902-1903 гадах Беларуская Сацыялістычная Грамада (БСГ), якая адзіная з усіх палітычных партый выступала як нацыянальна-беларуская партыя, вылучала і адстойвала ідэю стварэння беларускай дзяржаўнасці

(першапачаткова ў форме нацыянальнай аўтаноміі). Гэтая ідэя апанавала думкамі не толькі этнічных беларусаў, але і ўкраінцаў, яўрэяў, літоўцаў, прадстаўнікоў іншых этнічных груп, продкі якіх доўгі час жылі на беларускай этнічнай тэрыторыі. Вядомая талерантнасць беларусаў, якая сфармавалася ў поліэтнічным соцыуме, давала надзею, што ў дэмакратычнай беларускай дзяржаве яны будуць рэальна карыстацца роўнымі правамі і атрымаюць магчымасці для развіцця сваёй культуры. Таму сярод барацьбітоў за беларускую дзяржаўнасць было многа не толькі этнічных беларусаў, але і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

На працягу 1918-1920 гадоў прадстаўнікі розных плыняў беларускіх нацыянальна-патрыятычных сіл спрабавалі рэалізаваць два напрамкі стварэння беларускай дзяржаўнасці: ліберальна-дэмакратычны і савецкі (сацыялістычны). Першая – арыентавалася на краіны Заходняй Еўропы з іх канстытуцыйна-заканадаўчымі традыцыямі, парламенцкім дэмакратычным ладам і дэмакратычнымі элементамі дзяржаўнага кіравання. Другая – лічыла прыймальным для Беларусі савецкую форму дзяржаўнай улады, дыктатуру пралетарыята.

Для рэалізацыі сваіх планаў першая плынь шукала падтрымку ў еўрапейскіх краін, арыентуючыся спачатку на Германію, потым – на Францыю. Аднак германскае ваеннае кіраўніцтва імкнулася да бескантрольнага грабяжу захопленых беларускіх тэрыторый, а палітыкі Францыі не мелі ніякага ўяўлення аб беларускім этнасе і яго гісторыі [6]. Палітыкі суседняй Польшчы, якая ўтварылася ў лістападзе 1918 года, марылі пра аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года і, натуральна, не хацелі бачыць на беларускай тэрыторыі ніякай іншай дзяржавы.

Больш рэалістычнай аказалася пазіцыя, занятая дзеячамі беларускага нацыянальнага руху, якія арыентаваліся на падтрымку Савецкай Расіі і яе лідэраў. Утварэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (студзень 1919 года) стала пачаткам рэальнага станаўлення ўласна беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Менавіта ў яе ўлонні былі закладзены дзяржаўныя, эканамічныя і культурныя інстытуты, спадкаемніцай якіх стала Рэспубліка Беларусь.

Бяда была ў тым, што і Савецкая Расія, і Польшча, маючы амбіцыёзныя мэты, не схільны былі разглядаць ССРБ як раўнапраўную ўдзельніцу міжнародных адносін, як суб'ект міжнароднай палітыкі. Сітуацыя ў Беларусі была вельмі складанай. Падчас савецка-польскай вайны наша дзяржава мела, але не выкарыстала шанец на захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці. Прапанова краін Антанты аб усталяванні мяжы паміж польскімі і беларускімі землямі па "лініі Керзана" была адкінута савецкім урадам. Чырвоная Армія працягвала наступленне на тэрыторыю Польшчы. 31 ліпеня адбылося другое абвяшчэнне БССР. "Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі" закранала тэрытарыяльнае пытанне толькі ў самых агульных рысах. Усходняя мяжа павінна была прайсці па мяжы Мінскай губерніі, а заходняя – вызначыцца ў ходзе савецка-польскай вайны.

12 кастрычніка быў заключаны дагавор аб перамір'і і папярэдніх умовах міру. Граніца БССР з Польшчай праходзіла з поўначы на поўдзень каля наступных населеных пунктаў: Ушачы – Пасвілле – Докшыцы – Радашковічы – Нясвіж –Чырвоная Слабада – Старобін – Мікашэвічы – Тураў. Расійскі ўрад прапанаваў, каб зыходнай асновай дагавора было пацвярджэнне Польшчай і Расіяй незалежнасці Украіны, Літвы і Беларусі. Але польскі бок выступіў рашуча супраць удзелу ў перагаворах прадстаўнікоў Беларусі і Украіны і хацеў мець справу толькі з РСФСР. У гэтым выпадку тэрытарыяльныя і іншыя правы Беларусі і Украіны страцілі б актуальнасць. Польскі бок імкнуўся да таго, каб гэты дагавор увасобіў ідэю заканчэння векавой барацьбы Польшчы і Расіі за спрэчныя землі [7].

18 сакавіка 1921 года паміж Савецкай Расіяй і Польшчай быў падпісаны Рыжскі мірны дагавор. У дачыненні да Беларусі ён быў цяжкім і несправядлівым. Да Польшчы адыходзіла тэрыторыя Заходняй Беларусі 112 тыс кв. км (амаль палова беларускай этнічнай тэрыторыі) з 4,6 млн чалавек насельніцтва (паводле даных 1931 года) [7]. З 208 тысяч кв. км. [8] беларускай этнічнай тэрыторыі толькі 52 тысячы апынуліся ў складзе Савецкай Беларусі і толькі 1,5 млн чалавек насельніцтва з 8 млн. [9].

Такім чынам, колішнія надзеі Каліноўскага не спраўдзіліся. Польскія палітычныя колы не бачылі і не хацелі бачыць у беларусаў ні іх нацыянальнай самасвядомасці, ні права сфармаваць незалежную нацыянальную дзяржаву. Савецкая ж Расія, наадварот, апынулася на баку захавання і развіцця незалежнай беларускай дзяржавы.

Для беларускага этнасу, для якога на працягу стагоддзяў моцным этнавызначальным фактарам была цэласнасць і адзінства тэрыторыі, раздзел гэтай тэрторыі на дзве часткі, паміж дзвюма дзяржавамі стаў сапраўднай трагедыяй. Беларусам ўсё цяжэй было стрымліваць асіміляцыйныя плыні. У складзе Польшчы беларускі этнас стаў ахвярай палітыкі паланізацыі. А ў Савецкай Беларусі беларусізацыя 20-х гадоў змянілася палітыкай контрбеларусізацыі. На гэты раз асіміляцыя закранула і вёску, руйнаваліся яе векавыя культурныя традыцыі. Калі здавалася, што ўжо нішто не прыпыніць, не ўратуе дэградацыю нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, у іх жыцці адбылася велізарнай значнасці гістарычная падзея: аб'яднанне заходнебеларускіх зямель з Савецкай Беларуссю.

Працэс, у выніку якога Заходняя Беларусь апынулася ў складзе СССР быў шматпланавым. Дагавор аб ненападзе паміж СССР і Германіяй, пачатак Другой сусветнай вайны, уступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі, Дагавор паміж СССР і Германіяй "Аб дружбе і граніцах" ад 28 верасня 1939 года, паводле якога Заходняя Беларусь заставалася пад кантродем СССР, – усе гэтыя падзеі і дагаворы патрабуюць асобнай размовы. Польскі ўрад у эміграцыі У. Сікорскага кваліфікаваў дагавор ад 28 верасня, як чацвёры падзел Рэчы Паспалітай. Але для беларускага народа прымусовае ўключэнне ў склад Польшчы ў 1921 гаду не адпавядала нацыянальным памкненням і не было справядлівым з пункту гледжання задавальнення яго нацыянальных інтарэсаў. У складзе ІІ Рэчы Паспалітай беларусы не атрымалі сваёй дзяржаўнасці, таму яны не ўспрымалі паражэнне Польшчы як спыненне існавання сваёй дзяржавы.

А вось ўз'яднанне беларускіх зямель восенню 1939 года насельніцтва ўспрымала як аднаўленне гістарычнай справядлівасці. Дзякуючы папярэдняму вяртанню беларускіх тэрыторый, якія знаходзіліся ў складзе Расіі (у 1924 і ў 1926 гадах), і ўз'яднанню Заходняй Беларусі з БССР этнічная беларуская тэрыторыя зноў апынулася ў складзе адзінай дзяржавы. Такім чынам, беларускі народ атрымаў галоўнае: сваю дзяржаўнасць на сваёй этнічнай тэрыторыі.

Праўда, па палітычных меркаваннях, сталінскі ўрад перадаў Літве Віленскі край з горадам Вільня. Сталінскае кіраўніцтва працягвала падзел беларускай этнічнай тэрыторыі і ў 1940 годзе, калі Літве былі перададзены 3 раёны Беларусі [10, 99], і ў пасляваенны час, калі да Польшчы адышлі 17 раёнаў Беластокскай вобласці і 3 раёны Брэсцкай вобласці [8]. Гэтыя факты – сведчанне грубага парушэння сталінскім кіраўніцтвам суверэнітэту аднОЙ з саюзных рэспублік.

Тым не менш, не гледзячы на ўсе негатыўныя моманты, была адноўлена цэласнасць беларускай этнічнай тэрыторыі. Спрыяльныя перспектывы развіцця этнасу складваліся дзякуючы і колькаснаму фактару. Тэрыторыя БССР павялічылася на 100 тыс. кв. км, а насельніцтва – на 4,7 млн чалавек, памеры рэспублікі (БССР) склалі 223 тыс. кв. км з насельніцтвам 10,2 млн чалавек [11, 259].

З уз'яднаным народам трэба было крыху больш лічыцца цэнтральным уладам краіны. Нельга было, як раней, грэбаваць культурна-нацыянальнымі інтарэсамі беларусаў. Бо ва ўяўленні іх заходняй часткі маглі б узнікнуць паралелі паміж тым, што рабілася "за Польшчай" і цяпер чыніцца савецкай уладай. На тэрыторыі Заходняй Беларусі пачалася беларусізацыя, прычым да гэтага франтальна прыступілі ўжо на першым годзе пасля ўз'яднання. Там, дзе да верасня 1939 года не функцыянавала ніводнай беларускай школы, праз год ужо мелася 4278. Нанава былі створаны і 173 рускамоўныя школы. На польскай мове навучанне вялося ў 932 школах, яўрэйскай – у 150, літоўскай – у 61, украінскай – у 49 [12, 462]. Такім чынам, аднаўляліся традыцыі супольнага існавання і развіцця на нашай тэрыторыі разнастайных этнічных груп.

Кіраўнік нашай дзяржавы неаднаразова падкрэсліваў, што беларусы – гэта адзіны народ. Рускія, палякі, яўрэі, прадстаўнікі іншых нацыянальных меншасцей зберагаюць свае этнакультурные асаблівасці, але ўсе нацыянальныя меншасці з'яўляюцца часткаю беларускага народа [2]. Беларуская нацыя таксама сёння будуецца на грамадска-палітычным адзінстве. У нашым выпадку, дзяржава – таксама аснова нацыі і інструмент яе захавання. Кароткі аналіз гісторыі станаўлення нацыянальнай ідэі сведчыць, што ўяўленне аб тым, што беларуская нацыя – гэта і ёсць беларуская дзяржава, прысутнічала ў беларусаў заўсёды.

Стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы дазволіла рэалізаваць нацыянальную ідэю. Але факт пабудовы нацынальнай дзяржавы не азначае вычэрпанасці нацыянальнай ідэі. Напрыклад, пасля аб'яднання Германіі вылучаная ў XIX стагоддзі ідэя адзінства германскай нацыі не была рэалізавана ў адзін момант. Яна працягвае працаваць, да таго ж узнікаюць новыя ідэі. Пабудова суверэннай дзяржавы – гэта не толькі задача сёнешняга дня. Многія даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што барацьба за суверэнітэт не завяршаецца яго абвяшчэннем. Суверэнітэт трэба абараняць палітычнымі, ідэалагічнымі, эканамічнымі і, у крайнім выпадку, ваеннымі сродкамі. Ёсць яшчэ шэраг задач, якія трэба вырашыць: завяршэнне фармавання дэмакратычнай прававой дзяржаўнасці, вышэйшай мэтай якой з'яўляецца забеспячэнне правоў і свабод сваіх грамадзян, забеспячэнне годнага ўзроўню жыцця і іншыя.

**Літаратура**

1. Бекус, Нелли. Белорусская нация в свете различных стратегий национального строительства / Нелли Бекус // "Змена пакаленняў, або беларускія адрознасці ў мэтах, каштоўнасцях і стратэгіі": материалы конференции, Варшава, 4-5 июня 2008 [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://nmnby.eu/pub/0808/20m.html. – Дата доступа:23.09. 2009

2. Бехтерев, Ю. Идеи из прошлого, открывающие будущее (материалы интервью главного редактора журнал «Беларуская думка» Вадима Гигина) / Ю. Бехтерев // Журнал «Директор», февраль 2008. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.director.by/cgi-bin/print.cgi?date=2008/02/28&name – Дата доступа: 8.09.2009

3. Носевич, В.А. Белорусы: становление этноса и «национальная идея» / В.А. Носевич // Белоруссия и Россия: общества и государства. – Москва: Права человека, 1998. – С. 11 – 30.

4. Навагродскі, Т. Этнічная самасвядомасць / Т. Навагародскі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 6, кн.II. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2003. – С.271.

5. Чернявская, Ю. Пять парадоксов национального самосознания белорусов / Ю. Чернявская. [Электронный ресурс] – Режим доступа. http://www.index.org.ru/journal/15/15-chern.html – Дата доступа: 5 .07. 2009

6. Толкачев, В.И. Эволюция белорусской государственности и национальная идея / В.И. Толкачев // "Архив", 2005, №2 [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://id.atiso.ru/node/71– Дата доступа: 3.09.2009
7. Траццяк, С. Рыжскі мір і падзел Беларусі / С. Траццяк // Гісторыя Беларусі: У 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 5: Беларусь у 1917- 1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.
8. Цітоў, В. Этнічная тэрыторыя / В. Цітоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 6, кн. II. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2003. – С. 272.
9. Касцюк, М., Хоміч, С. Па шляху нацыянальнага аб'яднання / М. Касцюк // Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000. – 2005. – Т. 5: Беларусь у 1917- 1945гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.
10. Марцуль, Г.С., Сташкевіч, М.С. Гісторыя Беларусі: насельніцтва. Фарміраванне і вызначэнне этнічных і дзяржаўна-адміністрацыйных межаў / Г.С. Марцуль, М.С. Сташкевіч. Беларускае замежжа: вуч. дапаможнік – Мн.: РІВШ пры БДУ,1997.–132 с.
11. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х частках. Ч. 2 / М.П. Касцюк [і інш.]; пад рэд. М.П. Касцюк (галоўны рэдактар). – Мн.: Беларусь. 1995. – 559 с.
12. Хоміч, С. Палітычныя, эканамічныя, сацыяльна-культурныя пераўтварэнні на савецкай аснове / С. Хоміч // Гісторыя Беларусі: У 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва. 2000-2005. – Т. 5: Беларусь у 1917-1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.

## ВЫСШАЯ ТЕХНИЧЕСКАЯ ШКОЛА И ПРОБЛЕМА ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ (1921-39 гг.)

**Кукса А.Н.**
УО «Белорусский национальный технический университет»

Отставание Беларуси в начале XX-го века в промышленном развитии во многом объяснялось отсутствием как соответствующих капиталовложений, национальной буржуазии, природных ресурсов, так и квалифицированных инженерных кадров. Ремесленный, кустарный характер промышленности не способствовал, в свою очередь, и созданию высшего технического вуза в Беларуси. Ещё более осложнилось социально-экономическое положение рабочих и крестьян Западной Беларуси после вхождения этой территории в состав Польши по Рижскому миру 1921 г. Положение белорусского населения в составе Польши осложнялось ещё и тем, что рабочие и крестьяне не имели возможности получать высшее образование. В связи с этим, те перспективы, которые открывались в Восточной Беларуси, притягивали к себе значительное количество студентов из Западной Беларуси которые с риском для жизни переходили нелегально через границу, чтобы получить высшее образование. Этот фактор советская пропаганда активно использовала в процессе подготовки почвы для воссоединения Западной и Восточной Беларуси в 1921–39 гг.

Первая мировая война, а вслед за ней события 1917 г. и гражданская война нанесли серьёзный урон системе подготовки и аттестации научных кадров, оформившейся в дореволюционной России. Декретом Совнаркома РСФСР от 1 октября 1918 г. «О некоторых изменениях в составе и устройстве государственных учебных и высших учебных заведений» были упразднены учёные степени и учёные звания. Вместо существовавших ранее учё-